Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

20 КАНАЛАЎ

Якой гасцініцы дадуць «зорку»?

СТАР. 6

Як мужык ад акулы па вадзе бег

СТАР. 8

Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

25 КРАСАВІКА 2014 г. ПЯТНІЦА № 77 (27687) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

«ЧАРНОБЫЛЬСКІЯ ТЭРЫТОРЫІ»: забяспечыць нармальнае функцыянаванне народнай гаспадаркі

Пачалася рабочая паездка Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі па тэрыторыях, пацярпелых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, паведамляе БЕЛТА.

Учора кіраўнік дзяржавы зрабіў аблёт тэрыторыі поўначы Мінскай і Магілёўскай абласцей, азнаёміўся з ходам пасяўной кампаніі.

Сёння Прэзідэнт пабывае ў пацярпелых раёнах Магілёўскай вобласці, наведае шэраг сельскагаспадарчых, сацыяльных аб'ектаў, правядзе запланаваную два гады назад нараду па пытаннях развіцця паўднёвай часткі Магілёўскай вобласці.

Некалькі гадоў таму кіраўнік дзяржавы даручыў кіраўніцтву Магілёўскай вобласці сумесна з урадам прадумаць стратэгію і напрамкі развіцця гэтых тэрыторый у мэтах забеспячэння нармальнага функцыянавання народнай гаспадаркі і павышэння ўзроўню жыцця людзей. Менавіта пра гэта і пойдзе размова на нарадзе з шырокім колам зацікаўленых, у час якой урад і мясцовыя органы ўлады даложаць Прэзідэнту выпрацаваныя комплексныя падыходы па перспектыўных напрамках развіцця паўднёвай часткі Магілёўскай вобласці.



ПАЛАЦ ЗДАРОЎЯ І РАДАСЦІ

Лічаныя дні застаюцца да адкрыцця Мінскага аквапарка «Лебядзіны», які ўключае ў сябе комплекс з дзвюх акваторый — адкрытай і закрытай, цэнтр з лазнямі, саўнамі і саляной пячорай, дзіцячы сямейны забаўляльны цэнтр, атракцыёны, трэнажорную залу, бар і рэстаран.

Сваю назву аквапарк атрымаў дзякуючы суседству з прыродна-біялагічным заказнікам «Лебядзіны». Ён стане 5-м па велічыні ў Еўропе і будзе здольны прымаць адразу да 2 тысяч наведвальнікаў.

Фотадымкі Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЦЫТАТА ДНЯ

Пётр ПРАКАПОВІЧ, віцэ-прэм'ер:

«Калі б грошы, якія беларусы «ўкладваюць» у эканоміку іншых дзяржаў, аддаючы перавагу імпартным таварам, былі патрачаны ўнутры краіны, то, па-першае, даходы насельніцтва раслі б больш хуткімі тэмпамі, па-другое, валюты ў нас засталося б столькі, што станоўчае сальда было б некалькі мільярдаў долараў, і наш рубель не тое што не дэвальвавaўся б, але паступова ўмацоўваўся, быў бы адной з самых устойлівых валют. Такім чынам, стымулюючы імпарт, мы пагаршаем свой жыццёвы ўзровень: за кошт таго, што губляем працоўныя месцы, падаткі. У сувязі з гэтым задача, якая ставіцца перад айчыннымі вытворцамі, заключаецца ў тым, каб забяспечыць больш хуткае, эфектыўнае аднаўленне сваіх пазіцый на ўласным рынку».

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 25.04.2014 г.

Долар ЗША	9970,00	■
Еўра	13790,00	▲
Рас. руб.	279,50	■
Укр. грыўня	863,20	▲

■ Як гэта было

СПЯКОТНАЯ ВЯСНА 86-га

Успаміны ліквідатара самай буйной тэхналагічнай катастрофы XX стагоддзя

26 красавіка 1986 года стала для дзясяткаў тысяч людзей рубяжом, які падзяліў іх жыццё на «да» і «пасля» аварыі на Чарнобыльскай АЭС. З картаў Беларусі, Расіі і Украіны зніклі дзясяткі вёсак, з'явіліся два гарады-прывіды... Масавая эвакуацыя насельніцтва з небяспечна забруджанай зоны скончылася літаральна праз некалькі дзён пасля надзвычайнага здарэння.

Як пасля высветлілася, Чарнобыльская станцыя мела шэраг істотных канструктыўных недахопаў. Тэхналогіі мантажу таксама парушаліся. Так, частка труб была зроблена не з цырконію, а з легіраванай сталі. Справа ў тым, што ўсе работы трэба было скончыць да пачатку чарговага партыйнага з'езда. Але незадоўга перад тым выявілася, што трубы з цырконію ператварыліся ў страшэнны дэфіцыт. І гэтае свядомае парушэнне тэхналогіі пазней стала адным з фатальных: трываласць труб са сталі значна меншая ў параўнанні з цырконіевымі. Калі тэмпература ў рэактары павысілася да крытычнай, то сталёвыя трубы элементарна пакарабаціліся. Магчымасці рэгуляваць магутнасць рэактара больш не было. І тады адбыўся выбух…

З уздзеяннем нябачнага чалавечаму воку ворага змагаліся дзясяткі тысяч ліквідатараў аварыі. Непасрэдны ўдзел у гэтай справе прыняў Штаб грамадзянскай абароны БССР, у якім 28 гадоў таму працаваў цяперашні **старшы выкладчык Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Уладзімір МУРАШКА.** Ён падзяліўся з карэспандэнтам «Звязды» сваімі ўспамінамі аб тым часе.

«Даводзілася чытаць чыноўнікам ледзьве не лекцыі па радыялогіі…»

— Я займаў пасаду намесніка начальніка аддзела, які адказваў за ўстойлівае функцыянаванне аб'ектаў народнай гаспадаркі ў надзвычайных сітуацыях, самай цяжкай з якіх з'яўляецца вайна. Мы вырашалі пытанні, звязаныя з эканомікай краіны, рабілі планы разліковага года на выпадак надыходу адной з такіх сітуацый — адным словам, разлічвалі бюджэт рэспублікі ў выпадку ўзнікнення бяды.

5 мая на тэрыторыі БССР мусілі пачацца вучэнні краін Варшаўскага дагавора, якія былі скіраваны на працу ў надзвычайных сітуацыях.

СТАР. 2

■ Аптымізацыя

ПОШТА «НА КОЛАХ» НІКОЛІ НЕ СПАЗНЯЕЦЦА

Іван Палын, пенсіянер з вёскі Новае Палессе, якая знаходзіцца за 20 км ад Лельчыцаў, ужо забыў тыя часы, калі ў вёсцы была стацыянарная пошта. Гаворыць, да перасоўнай прывык вельмі хутка. Аказалася, што зручнасцяў ад такой формы абслугоўвання вельмі шмат.

Фота Міхаіла НІКІЦЕНКІ.

Начальнік перасоўнага аддзялення сувязі Вера БУЦЬКО і кіроўца Анатоль КАВАЛЕНКА перадаюць пасылку жыхарцы вёскі Буда-Лельчыцкая.

— Да нас на машыне прыязджае начальнік перасоўнага аддзялення сувязі Вера Буцько, з людзьмі пагаворыць, усё, што трэба, прывязе — нам грэх скардзіцца. Вяскоўцы вельмі задаволеныя: паштарка і прэсу свежую прынясе ў тэрмін, і дапаможа ў аплаце паслуг ці афармленні падпіскі. Але ж для нас самае галоўнае — каб пенсія была своечасова. З гэтым праблем няма ніколі. Акрамя таго, паштавікі прывозяць цукар, крупы, макарону, хлеб — усё танней, чым у аўталаўцы.

Старшыня Ударненскага сельсавета Лельчыцкага раёна Алена СЯРДЗЮК кажа, што на іх тэрыторыі сем населеных пунктаў і толькі адно стацыянарнае аддзяленне сувязі — у аграгарадку Ударнае. Астатнія шэсць вёсак абслугоўваюць паштавікі з райцэнтра:

— Першапачаткова, пакуль асвойвалі такую сістэму абслугоўвання вяскоўцаў, хваляваліся, што насельніцтва будзе незадаволена.

СТАР. 2

■ Залатая Ліцера

Міністр інфармацыі Алег Праляскоўскі ўручае Гран-пры дырэктару—галоўнаму рэдактару РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» Алесю Карлюкевічу.

КАНКУРЭНЦЫЯ СЛОЎ — КАНКУРЭНЦЫЯ ДУМАК

Спачатку здаецца, што натхненне вельмі лёгкае, ледзь улоўнае, летуценнае... Калі бярэш статуэтку «Залатой Ліцеры» ў рукі, то адразу адчуваеш бронзавы цяжар адказнасці. Але ж той, хто хаця б адноўчы зразумеў, што значыць «нараджаць» словы, сказы, абзацы і, нарэшце, тэкст, ведае і пра цяжар самога натхнення, пад якім часта можна і загінуць.

На думку **першага намесніка міністра інфармацыі Беларусі Ліліі АНАНІЧ,** конкурс друкаваных сродкаў масавай інфармацыі дапамагае гадаваць нацыянальную інфармацыйную прастору. «Дзесяць гадоў таму ініцыятыва Міністэрства інфармацыі аб правядзенні конкурсу атрымала падтрымку Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі. Менавіта тады выдатная скульптура Аляксандра Фінскага набыла сваю назву і медыйнае жыццё», — адзначыла Лілія Ананіч на цырымоніі ўзнагароджання. Паводле яе слоў, больш за дзвесце натхняльных статуэтак за гэты час знайшлі сваіх гаспадароў у розных кутках Беларусі.

Галоўная журналісцкая ўзнагарода — мара, бадай, кожнага газетчыка. І, хутчэй за ўсё, справа нават не ў жаданні здаволіць пачуццё гордасці. Ён кожны дзень шукае, думае, піша, зноў шукае, бяжыць, каб паспець, паспявае — і гэтак бясконца. Нават у адпачынку і быццам бы ў выхадныя ён не выходзіць з гэтага кола. Выйшаў — усё, ты не журналіст. І ўзнагарода патрэбна для таго, каб разумець, што ты бегаеш не марна. Каб самому сабе сказаць: «Раз атрымалася, значыць, трэба яшчэ лепей». Толькі гэта і патрэбна творчаму чалавеку — прызнанне. Наша газета яго адчула: дзве «Ліцеры» (сярод якіх Гран-пры) і чатыры лаўрэаты — выдатны вынік. Што асабліва прыемна адзначыць, — сярод іх — партал Выдавецкага дома «Звязда». Мы стараемся ісці ў нагу з часам, актыўна працуем над інтэрнэт-версіяй, і нашу працу заўважылі, спадзяёмся, і нашы чытачы.

Усе, хто атрымаў статуэткі ці стаў намінантам, хутка забыліся на ўзнагароды і зноў без стомы працуюць. Хаця яшчэ пазаўчора, перад цырымоніяй у Палацы Рэспублікі, усе нервова праходжваліся па зале і думалі, ці вартыя яны ўсё ж такі бронзавага «натхнення»… Многія журналісты схільны да самакрытыкі, і гэта, шчыра кажучы, добра. Нават дапамагае ў працы. Але гэта ж і прычына хвалявання. Усе — зусім «зялёныя», вопытныя і агульнапрызнаныя мэтры — аднолькава перажывалі, як школьнікі перад выхадам да дошкі. Як бы там ні было, а хочацца адчуць сябе першым. Хаця б ненадоўга. Яшчэ больш хваляванне ўзрастае тады, калі выходзіш на сцэну і побач з табою стаяць калегі з іншых выданняў. Раней ты стаяў з імі побач з дыктафонам у выцягнутай руцэ, а цяпер думаеш: «Можа быць, ён глыбей за мяне зразумеў і апісаў нейкую з'яву ці падзею?» Але вось называюць пераможцу. Нават калі гэта не ты, усё роўна радуешся. За свайго калегу, за ягоную працу. Шчыра віншуеш пераможцу і разумееш, што сапраўды нешта недапрацаваў. А гэта яшчэ больш падбадзёрвае на плённую дзейнасць, чым перамога, бо ты ўжо прыдумаў, што напішаш далей. Кола не мае канца. Наступным годам сустрэнемся зноў!

Нашы пераможцы: Святлана Барысенка, Уладзіслаў Кулецкі, Святлана Яскевіч, Яўген Пясецкі.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ВАТЫКАН КАНАНІЗУЕ АДРАЗУ ДВУХ ПАНТЫФІКАЎ

Ян XXIII і Ян Павел II будуць прылічаны да ліку святых. На цырымонію кананізацыі, якую ў нядзелю будзе праводзіць дзейны пантыфік Францішак, з'язджаюцца сотні тысяч паломнікаў з усяго свету. Акрамя таго, у Ватыкан прыбудуць 19 кіраўнікоў дзяржаў і 24 прэм'ер-міністры. Доступ на цырымонію адкрыюць для ўсіх ахвотных, але месца на плошчы Святога Пятра можа хапіць не ўсім. Рашэнне аб прылічэнні пантыфікаў да ліку святых было прынята ў чэрвені 2013 года. Кананізацыя магчымая толькі пасля пацвярджэння двух створаных цудаў. Аднак у выпадку Яна Паўла II папа Францішак пайшоў на адступленне ад правілаў: пакуль удалося даказаць толькі адзін з іх. Яго малітвамі была вылечана жанчына з Коста-Рыкі, якая пакутавала на невылечную хваробу. Рашэнне аб прылічэнні да ліку святых было прынята па сукупнасці заслуг нябожчыка перад Касцёлам.

ПУЦІН НАЗВАЎ СУР'ЁЗНЫМ ЗЛАЧЫНСТВАМ ПРЫМЯНЕННЕ КІЕВАМ АРМІІ ЎНУТРЫ КРАІНЫ

Калі рэжым у Кіеве пачаў прымяняць войска супраць насельніцтва ўсярэдзіне краіны, гэта, без усялякіх сумненняў, вельмі сур'ёзнае злачынства супраць свайго народа. Пра гэта заявіў прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін. Прэзідэнт РФ нагадаў, што нават легітымны кіраўнік Украіны Віктар Януковіч не адважыўся на падключэнне арміі для разгону мітынгаў у Кіеве, хоць меў на гэта адпаведны мандат. Пуцін перакананы, што сённяшнія ўлады ў Кіеве такога мандату не маюць, а легітымнасць іх дзеянняў наогул толькі частковая. Паводле яго слоў, тое, што адбываецца ў Данецку, — не вострая фаза канфлікту. Гэта карная аперацыя. Дзеянні ўладаў Кіева супраць народа Украіны будуць мець для іх наступствы, у тым ліку ў плане міждзяржаўных адносін РФ і Украіны.

ISSN 1990 - 763X

ВІЗА Ў ЕГІПЕТ ПАДАРАЖЭЕ З 1 МАЯ

З пачатку мая турыстычныя візы ў Егіпет падаражэюць на пяць долараў. Турыстам давядзецца плаціць ужо не 15, а 20 долараў. Аднак мясцовыя ўлады ўпэўнены, што гэта не адаб'ецца на патоку турыстаў. «У любым выпадку нашы візы па-ранейшаму застаюцца аднымі з самых танных у свеце», — лічыць міністр турызму Егіпта Хішам Зазу.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ДЗЁННЫ СОН СКАРАЧАЕ ЖЫЦЦЁ?

Аматарам «наганяць» час, які трэба было выдаткаваць на сон ноччу, за кошт дзённых «пересыпаў» у офісе або дома, варта быць больш асцярожнымі. Новыя даныя сведчаць, што такая звычка павышае рызыку заўчаснай смерці, піша The Times of India. Выданне спасылаецца на даследаванне, праведзенае навукоўцамі Кембрыджскага ўніверсітэта. У ім прынялі ўдзел больш за 16 тысяч чалавек, якіх апыталі на прадмет іх звычак спаць альбо не спаць удзень. Затым навукоўцы на працягу 13 гадоў назіралі за гэтымі людзьмі і зрабілі непрыемнае для аматараў дзённага сну адкрыццё. Аказалася, што людзі ва ўзросце ад 40 да 79 гадоў, якія практыкуюць невялікі сон днём (каля гадзіны), мелі на 14% больш шанцаў памерці ў параўнанні з тымі, хто не драмаў. Больш працяглы дзённы сон (гадзіну ці больш) павялічваў рызыку смерці на 32%, гаворыцца ў даследаванні, апублікаваным у «Амерыканскім часопісе эпідэміялогіі». Пры гэтым дакладная прычына павелічэння рызыкі смерці ў тых, хто спіць удзень, пакуль не вядома.

КАРОТКА

У тэлефоннай размове міністраў замежных спраў Беларусі Уладзіміра Макея і Расіі Сяргея Лаўрова былі абмеркаваны бягучыя пытанні беларуска-расійскага супрацоўніцтва, ход падрыхтоўкі пасяджэння Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў у Мінску 29 красавіка.

Нацыянальны банк Беларусі рэкамендаваў банкам прымаць ад грамадзян валюту з нязначнымі пашкоджаннямі. Для гэтага банкам рэкамендавана перагледзець пералік прыкмет плацежнасці банкнотаў у замежнай валюце.

Кінатэатр «Масква» адкрыецца пасля мадэрнізацыі ў Мінску 1 мая прэм'ерай фільма «Кухня ў Парыжы».

РУП «Беларуская АЭС» атрымала поўную ліцэнзію на будаўніцтва першага энергаблока атамнай станцыі.

Намінальная налічаная сярэднямесячная заработная плата работнікаў Беларусі ў студзені-сакавіку гэтага года склала Br5 млн 497,2 тыс., у тым ліку ў сакавіку — Br5 млн 753,1 тыс. і павялічылася ў параўнанні з лютым 2014 года на 6,8 працэнта, або на Br363,9 тыс.